*С. А. Талмачова,*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка,
Мінск, Рэспубліка Беларусь

*S. Talmachova,*
PhD in History, Associate Professor,
Belarusian State Pedagogical University
named after Maxim Tank,
Minsk, Republic of Belarus

# КАДРАВАЯ ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАГА ЎРАДА Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ІНСТЫТУТА ЗЕМСКІХ НАЧАЛЬНІКАЎ У БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТ.

# PERSONNEL POLICY OF RUSSIAN GOVERNMENT TOWARDS ZEMSTVO CHIEFS IN BELARUS IN THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

Артыкул падрыхтаваны пры падтрымцы
Беларускага рэспубліканскага фонда
фундаментальных даследаванняў

У артыкуле раскрываецца эвалюцыя дзяржаўнай кадравай палітыкі ў дачыненні да земскіх начальнікаў. Адмена абмежаванняў па саслоўнай прыкмеце законам ад 5 кастрычніка 1906 г. прывяла да неабходнасці ўзмацнення кантролю пры падборы кадраў. З мэтай павышэння іх кваліфікацыі была ўведзена пасада кандыдата земскага начальніка, а таксама экзамен дзеля высвятлення ўзроўня ведання прэтэндэнтамі іх службовых абавязкаў і заканадаўства. Пры гэтым захоўваліся абмежаванні ў адносінах да католікаў пры займанні пасад у мясцовым кіраванні ў Беларусі.

Ключавыя словы: Беларусь; земскі начальнік; кадравая палітыка; кандыдат на пасаду; рэвізія; мясцовае кіраванне.

The article reveals the evolution of personnel policy of autocracy towards zemstvo chiefs. Abolition of estate limitations on 5th of October 1906 led to the necessity of strengthening of control during the selection of personnel. For the purpose of upgrading their qualification there has been introduced a position of a candidate of zemstvo chief as well as an examination for revealing the level of aspirants' knowledge of their official responsibilities and legislation. At the same time there stayed the limitations towards Catholics in their taking the positions in the local governing in Belarus.

Keywords: Belarus; zemstvo chief; personnel policy; candidate to a position; revision; local governing.

Земскія начальнікі – мясцовыя судова-адміністрацыйныя службовыя асобы, якія дзейнічалі ў большасці губерняў Расійскай імперыі ў адпаведнасці з законам ад 12 ліпеня 1889 г. [1]. На тэрыторыі Беларусі з-за недаверу з боку ўрада да мясцовага спадчыннага дваранства рымска-каталіцкага веравызнання гэты закон быў рэалізаваны значна пазней – у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях – з 1901 г., а ў Віленскай і Гродзенскай – з канца 1903 г.

Паспяховая рэалізацыя «Положения о земских участковых начальниках» ад 12 ліпеня 1889 г. [1] патрабавала стварэння дзеяздольнага адміністрацыйнага апарату. Таму ў адпаведнасці з «Положением...» пры прызначэнні на пасады земскіх начальнікаў уводзіўся нармальны і экстраардынарны парадак. Пры нармальным парадку існавалі дзве катэгорыі кандыдатаў на гэта званне. Агульнымі ўмовамі для абедзвюх катэгорый быў узрост больш за 25 гадоў і прыналежнасць да спадчыннага мясцовага дваранства. Пры гэтым у першую катэгорыю ўваходзілі: 1) асобы, якія праслужылі ў губерні не менш за тры гады на пасадзе прадвадзіцеля дваранства – да іх не прад'яўляўся ніякі маёмасны цэнз; 2) дваране, што атрымалі вышэйшую адукацыю, ці праслужылі ў губерні не менш трох год на пасадзе міравога пасрэдніка, міравога суддзі ці неадменнага члена сялянскай прысутнасці, калі пры гэтым яны самі ці іх жонкі мелі ва ўласнасці ў межах павета не менш паловы памеру зямлі, неабходнага для ўдзелу ў выбранні гласных ў павятовы земскі сход, ці іншай нерухомай маёмасцю на суму больш за 7 500 руб.

Другую катэгорыю кандыдатаў на пасаду земскага начальніка складалі: 1) асобы з параўнальна вялікім (падвоеным) маёмасным цэнзам і параўнальна нізкім адукацыйным цэнзам (сярэдняя адукацыя і класны чын); 2) асобы, якія захавалі ў межах павета хаця б толькі сядзібу, але падыходзілі па сваім адукацыйным ці службовым цэнзе пад умовы для кандыдатаў першай катэгорыі [1, с. 511–513].

У заходніх губернях земскія начальнікі прызначаліся парадкам, які быў вызначаны для губерняў, дзе не адбываліся дваранскія выбары. Гэта было пацверджана законам ад 19 красавіка 1904 г. «О некоторых изменениях и дополнени-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ях в существующих постановлениях о земских участковых начальниках», у якім адзначалася, што ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях земскія начальнікі прызначаліся міністрам унутраных спраў, а ў Віленскай і Гродзенскай – генерал-губернатарам па прапановах губернатараў, незалежна ад прыналежнасці іх да мясцовага дваранства і валодання імі нерухомай маёмасцю [2, с. 369].

Такі парадак забяспечваў у пэўнай ступені задавальняючы свайму прызначэнню склад земскіх начальнікаў толькі ў першыя гады ўвядзення названага інстытута, калі дзейнасць яго не была асабліва складанай і кантынгент мясцовых дваран-землеўладальнікаў даваў дастатковую колькасць кандыдатаў. Нагадаем, што на працягу першага дзесяцігоддзя яго функцыянавання ў імперыі на тэрыторыі Беларусі названага інстытута не існавала.

З цягам часу пасада земскіх начальнікаў ускладнялася шматлікімі абавязкамі па спагнанні акладных збораў, народнаму харчаванню, справах землеўладкавання сялян падчас рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы і інш. Таму іх дзейнасць патрабавала ўсебаковага ведання законаў і іх ўрадавых тлумачэнняў, а таксама знаёмства з практыкай кіравання ўчасткам. Колькасць жа дваран, якія маглі заняць названую пасаду, значна паменшылася. Адной з прычын было тое, што частка іх з пачатку ХХ ст. накіроўвалася на службу ў заходнія губерні, дзе большасць мясцовых дваран-землеўласнікаў была рымска-каталіцкага веравызнання і ў адпаведнасці з законамі і цыркулярамі 60-х гг. ХІХ ст. не дапушчалася да пасад на дзяржаўнай службе ў краі.

Сукупнасць усіх гэтых прычын прывяла да таго, што парадак прызначэння на пасаду земскіх начальнікаў быў прызнаны Міністэрствам унутраных спраў незадавальняючым. Сапраўды, водзывы губернатараў і даклады асоб, якія былі накіраваны цэнтральнымі ўстановамі ў губерні з рэвізіямі, сведчылі, што новапрызначаныя земскія начальнікі вельмі мала былі знаёмы з заканадаўствам аб сялянах і мясцовымі асаблівасцямі края. Гэта выклікала слушныя нараканні з боку насельніцтва [3, с. 3–4]. Прынамсі, у Віленскай губернскай прысутнасці адзначалі, што большасць земскіх начальнікаў пры ўвядзенні рэформы ў 1903 г. прызначана была «без достаточной практической подготовки» [7, с. 1].

У сувязі з гэтым у адпаведнасці з законам ад 19 красавіка 1904 г. пры губернскіх прысутнасцях былі створаны пасады кандыдатаў да земскіх начальнікаў для практычнай папярэдняй падрыхтоўкі іх да далейшага выканання службовых абавязкаў [2, с. 370]. Міністэрства ўнутраных спраў адзначала, што частка кандыдатаў набіралася з асоб, якія не адпавядалі адукацыйнаму, маёмаснаму і службоваму цэнзу, усталяванаму Палажэннем 12 ліпеня 1889 г. і законам 19 красавіка 1904 г. [3, с. 14]. Пры гэтым, як паказаў вопыт, у якасці кандыдатаў магла быць падрыхтавана толькі параўнальна нязначная іх колькасць, а непрацяглы час на пасадзе недастаткова забяспечваў падрыхтаванасць асоб да службы ў якасці земскага начальніка.

Указам ад 5 кастрычніка 1906 г. «Об отмене некоторых ограничений в правах сельских обывателей и лиц других бывших податных состояний» пашыралася кола асоб, якія маглі займаць пасаду земскага начальніка [4, с. 891]. У адпаведнасці з ім «всем российским подданным», незалежна ад паходжання, за выключэннем іншародцаў, даваліся аднолькавыя правы ў адносінах да дзяржаўнай службы. Ліквідаваліся ўсе асаблівыя перавагі дваранства на займанне некаторых пасад па прызначэнню ад урада ў залежнасці ад саслоўнага паходжання.

Як ужо адзначалася, пашыралася кола пытанняў, якія павінны былі вырашаць земскія начальнікі. З гэтай прычыны Міністэрства ўнутраных спраў палічыла магчымым перадаць пэўную частку абавязкаў кандыдатам да земскіх начальнікаў. У прыватнасці, цыркулярам МУС № 53 ад 27 верасня 1907 г. кандыдатам, якія камандзіраваліся ў дапамогу земскім начальнікам, давалася права самастойна вырашаць адміністрацыйныя справы па прымяненні ўказа ад 9 лістапада 1906 г. Такая пастанова была выклікана значным павелічэннем у некаторых губернях справаводства земскіх начальнікаў у сувязі з пачаткам рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы. Адзначалася, што ў дапамогу ім маглі быць накіраваны нават і іншыя чыноўнікі, з прадстаўленнем ім такіх жа паўнамоцтваў, як і кандыдатам, у вырашэнні спраў па прымяненні названага ўказа [3, с. 13]. Таму Міністэрства ўнутраных спраў прыйшло да высновы аб неабходнасці папярэдніх іспытаў для асоб, якія прызначаліся на пасаду земскага начальніка і кандыдата. З гэтай прычыны ў маі 1907 г. пры Земскім аддзеле МУС была распрацавана і зацверджана праграма іспытаў для асоб, што прызначаліся на пасаду земскага начальніка непасрэдна міністэрствам, калі ў губернатараў не было мясцовых кандыдатаў [3, с. 4; 5, с. 20].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што нават прэтэндэнты з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй паказвалі нярэдка поўнае незнаёмства з заканадаўствам аб сялянах і з прымяненнем яго на практыцы, асабліва з землеўладкавальнымі законамі 1906 г. Стала відавочнай слабая кампетэнтнасць і непадрыхтаванасць да службовай дзейнасці многіх з тых, хто прызначаўся на пасаду земскіх начальнікаў. Так, з 38 праэкзаменаваных асоб мелі вышэйшую адукацыю 8 чал., сярэднюю – 18, ніжэй за сярэднюю – 12 чал. У выніку толькі 33 асобы былі прызнаны належнымі да пасады земскага начальніка, але многія з іх здолелі вытрымаць іспыты на другі ці трэці раз, часам на працягу 2 і больш месяцаў. Пасля паспяховай здачы экзамену кандыдаты накіроўваліся на некаторы час «на практыку» да земскага начальніка 1 участка Пецярбургскага павета [3, с. 15].

З прычыны такіх вынікаў экзамену міністр унутраных спраў распаўсюдзіў цыркуляр № 6 ад 23 студзеня 1908 г. аб неабходнасці ўвесці сістэму іспытаў для ўсіх наогул асоб, якія прызначаліся на пасаду земскіх начальнікаў, у тым ліку і па прадстаўленням мясцовай адміністрацыі [3, с. 15]. Напярэдадні губернатарам была разаслана праграма экзаменаў з прапановай абмеркаваць яе па сутнасці, а таксама выказаць свае меркаванні адносна арганізацыі такіх іспытаў. Адказы ад губернатараў былі аднадушнымі. Усе выказаліся аб пажаданасці і неабходнасці папярэдніх экзаменаў. Гэтак жа аднадушна раней выказаліся і дэлегаты з'езда неадменных членаў губернскіх прысутнасцей, які адбыўся ў кастрычніку 1907 г. [6].

Па распараджэнні міністра ўнутраных спраў з гэтага часу для асоб, якія хадайнічалі аб прызначэнні на пасаду земскага начальніка, у губернскіх прысутнасцях праводзіліся іспыты. Яны адбываліся не менш 4 разоў у год у вызначаныя і загадзя абвешчаныя тэрміны ў звычайным складзе губернскай прысутнасці. Пры гэтым асабліва адзначалася неабходнасць наяўнасці губернскага прадвадзіцеля дваранства, упраўляючага казённай палатай, старшыні (ці пракурора) акруговага суда і ўсіх неадменных членаў прысутнасці. Тэрмін экзаменаў вызначаўся губернатарам, але на пачатку кожнага года ён прадстаўляў гэтыя звесткі ў МУС для своечасовага ўзгаднення часу камандзіровак прадстаўнікоў міністэрства з рэвізіямі ў губерні «в целях придания ему (правядзенню экзаменаў. – С. Т.) необходимых единообразия и правильности» [3, с. 16].

Губернскія прысутнасці кіраваліся той праграмай, якую распрацавала Міністэрства

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

яе пашырыць. Адной з задач экзамену была, перш за ўсё, грунтоўная (па ўсіх раздзелах праграмы) праверка ведаў законаў і правілаў, якія тычыліся дзейнасці земскага начальніка. Пры гэтым пры незадавальняючай здачы экзамену прэтэндэнт на пасаду меў магчымасць падрыхтавацца і праз пэўны тэрмін паўтарыць спробу. Міністэрствам ўнутраных спраў адзначалася, што кола асоб, якія дапушчаліся да іспытаў, «в то же время отнюдь не изменяет ни в чем установленных действующим законом требований ценза сословного, имущественного, образовательного и служебного в тех сочетаниях и той последовательности, как сие указано в законе» [3, с. 17]. Ад экзаменаў вызваляліся толькі тыя асобы, якія ўжо мелі вопыт работы «в деле крестьянского управления» (напрыклад, былыя неадменныя члены губернскіх прысутнасцей, чыноўнікі па сялянскіх справах і інш.) [3, с. 18]. Міністр унутраных спраў адзначаў, што тых, хто вытрымліваў экзамены, «весьма желательно» было накіроўваць на пэўны тэрмін для далейшага практычнага азнаямлення са справай да аднаго з земскіх начальнікаў па выбары губернатара. Аб важнасці вынікаў экзаменаў сведчыць тое, што ў прадстаўленнях аб асобах, якія былі прапанаваны губернатарам на пасаду земскага начальніка, неабходна было абавязкова ўказаць «о степени успешности произведенных сими лицами испытаний» [3, с. 19].

Пры Земскім аддзеле МУС былі створаны спецыяльныя курсы для падрыхтоўкі прэтэндэнтаў на месца земскага начальніка. 6 лістапада 1908 г. міністрам унутраных спраў былі зацверджаны «Правила о временных курсах для подготовки лиц, желающих подвергнуться испытанию на должность земского начальника» [3, с. 31–32]. Мэтай курсаў было азнаямленне слухачоў з законамі і распараджэннямі ўрада, якія мелі непасрэднае дачыненне да сялян. Пасля не менш 4 тыдняў штодзённага навучання слухачы маглі здаваць экзамен спецыяльнай камісіі пад старшынствам упраўляючага Земскім аддзелам. Тым, хто паспяхова вытрымаў іспыты, выдавалася пасведчанне [3, с. 32].

Як ужо адзначалася, для тых чыноўнікаў, якія ўжо мелі вопыт практычнай работы на пасадах у «сялянскіх» установах, ніякіх экзаменаў з мэтай праверкі іх службовай адпаведнасці не прадугледжвалася. Аднак шматлікія скаргі і нараканні на дзейнасць земскіх начальнікаў патрабавалі пэўнай рэакцыі з боку ўлады. З гэтай прычыны час ад часу ў імперыі праводзіліся рэвізіі дзейнасці мясцовых губернскіх і павято-

вых устаноў па сялянскіх справах. З 1908 г. такія рэвізіі ўрад вырашыў праводзіць рэгулярна.

У адпаведнасці з цыркулярам МУС № 6 ад ад 23 студзеня 1908 г., напрыклад, у Віленскай губерні штогод прызначаліся па 4 тэрміны правядзення экзаменаў па распрацаванай Міністэрствам унутраных спраў праграме, якая была дапоўнена губернскай прысутнасцю. У іспытах удзельнічалі кандыдаты на пасаду земскага начальніка і асобы, якія хадайнічалі аб прызначэнні. За 1908–1913 гг. у губерні былі праэкзаменаваны 48 чал. Іспыты вытрымалі 43 чал., з іх 1 – «выдатна», 2 – «вельмі добра», 4 – «добра», 14 – «цалкам задавальняюча» і 22 – «задавальняюча». Віленская губернская прысутнасць адзначала, што прадпрынятая МУС мера для ўдасканалення асабовага складу земскіх начальнікаў прынесла вялікую карысць [7, с. 4–5].

У 1909 г. адбыўся з’езд неадменных членаў губернскіх прысутнасцей, на якім быў заслуханы даклад Земскага аддзела МУС. Было адзначана, што да 1 студзеня 1909 г. з большасці губерняў, акрамя 9 (у тым ліку Магілёўскай) былі дасланы справаздачы аб выніках рэвізій земскіх начальнікаў, праведзеных на месцах. Пры гэтым толькі ў трох губернях (Мінскай, Калужскай і Смаленскай) планы правядзення рэвізіі былі выкананы ў поўным аб’ёме. Найбольшая колькасць земскіх начальнікаў (31 чал.) была абрэвізавана ў Мінскай губерні. У пераважнай большасці губерняў Расійскай імперыі планы не былі выкананы нават напалову [8, с. 104]. Адначасова ў шэраг губерняў былі накіраваны з рэвізіямі і чыноўнікі Земскага аддзела МУС. Так, мясцовыя ўстановы па сялянскіх справах Магілёўскай губерні рэвізаваў сапраўдны стацкі дарадчык Сцяфановіч [8, с. 105]. У цэлым адзначалася, што вынікам рэвізій, з аднаго боку, было «совершенное устранение от дела» асоб, якія не адпавядалі патрабаванням па сваіх службовых якасцях і выніках працы. З другога боку, МУС атрымлівала звесткі аб мясцовым кадравым патэнцыяле для замяшчэння больш высокіх пасад, а таксама для рэалізацыі новых мерапрыемстваў урада. Адначасова выпраўляліся недахопы дзейнасці тых ці іншых прадстаўнікоў адміністрацыі, якія аказаліся «не на надлежащей высоте». Пры гэтым земскія начальнікі атрымлівалі інструкцыі па паляпшэнні сваёй працы. У выніку рэвізій былі адзначаны і лепшыя з іх [8, с. 105–106].

Удзельнікі з’езда прыйшлі да высновы, што новапрызначаных земскіх начальнікаў неабходна рэвізаваць праз 4–6 месяцаў пасля прызначэння [8, с. 106]. Была распрацавана і зацверджана новая праграма рэвізіі земскіх начальнікаў, якая была разаслана губернатарам у адпаведнасці з цыркулярам МУС ад 14 красавіка 1909 г., дзе даваліся ўказанні аб далейшым прарадку правядзення рэвізій сялянскіх устаноў [8, с. 108–109].

Калі ў цэлым па імперыі ўзнікала пытанне аб прафесійнай падрыхтаванасці земскіх начальнікаў, то на тэрыторыі Беларусі яно было больш складаным. Так, у ліпені 1903 г., яшчэ на этапе падрыхтоўкі ўвядзення ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях інстытута земскіх начальнікаў, міністр унутраных спраў В. Плеве нагадаў Віленскаму генерал-губернатару П. Святаполк-Мірскаму аб неабходнасці выканання закона ад 27 мая 1864 г. і пазбягаць прызначэння на пасады земскіх начальнікаў «лиц польского происхождения и католического исповедания» [9, арк. 4]. Аднак Віленскі генерал-губернатар меркаваў, што «поляк, идущий в земские начальники, следовательно, на дело, руководимое русским правительством, без сомнения так или иначе отторгается от среды польского общества, которое желает оставаться оппозиционным. Поэтому ... включение поляков в русскую служебную среду не может не ввести раскола в само польское общество и вместе с тем до известной степени переработать, в благоприятном для правительства смысле, пошедших на встречу русскому обществу поляков» і лічыў «назначение некоторого числа лиц польского происхождения в число земских начальников ... края с точки зрения правительственных в нем интересов выгодным» [9, арк. 7]. У выніку Мікалай II падпісаў дазвол на замяшчэнне католікамі пасад земскіх начальнікаў па тры чалавекі ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях у якасці эксперыменту [9, арк. 33].

Такі падыход даў падставу губернатарам накіроўваць хадайніцтвы аб прызначэнні католікаў на пасаду кандыдатаў да земскіх начальнікаў. Пры гэтым яны стараліся трымацца «квоты» ў тры чалавекі на губерню. Так, у кастрычніку 1904 г. Гродзенскі губернатар хадайнічаў перад міністрам унутраных спраў аб прызначэнні трох асоб рымска-каталіцкага веравызнання на названую пасаду. Пры гэтым ён адзначаў, што земскі начальнік 4-га ўчастка Брэсцкага павета Грабоўскі (католік), закліканы падчас вайны ў дзеючую армію, зарэкамендаваў сябе як «отличный и любимый своими товарищами земский начальник, принесший большую пользу своему участку» [9, арк. 15 адв.].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінскі губернатар у студзені 1905 г. таксама хадайнічаў аб дазволе тром асобам з мясцовых спадчынных дваран-католікаў заняць вакансіі земскіх начальнікаў у губерні [9, арк. 43–43 адв.]. Аднак А. Булыгін, які змяніў П. Святаполк-Мірскага на пасадзе міністра ўнутраных спраў, гэта і шэраг падобных хадайніцтваў адхіліў [9, арк. 44–50 адв.]. Сваю адмову ён матываваў тым, што пасля ўказа ад 12 снежня 1904 г. меркавалася змена дзеючых законаў «о правах уроженцев отдельных местностей» [9, арк. 50].

У маі 1905 г. Мікалай II зацвердзіў журнал Камітэта міністраў, у якім утрымліваўся спіс пасад, якія не падлягалі «занятию в 9 западных губерниях лицами польского происхождения». Земскія начальнікі ў гэты пералік не ўвайшлі [9, арк. 56–57 адв.]. Аднак мясцовая адміністрацыя па-ранейшаму прытрымлівалася меркавання аб непажаданасці прызначэння «палякаў» земскімі начальнікамі. Так, у маі 1909 г. Віленскі губернатар Дз. Любімаў пісаў кіраўніку Земскім аддзелам МУС Я. Ліцвінаву аб «затруднительности» прызначэння земскім начальнікам двараніна рымска-каталіцкага веравызнання С. фон Кехлі, паколькі ў Віленскай губерні ўжо было 4 земскіх начальніка-католіка, што складала 8 %. Дз. Любімаў лічыў «идти далее по этому пути ... положительно неудобным» [9, арк. 67–67 адв.], нягледзячы на тое, што кандыдатура С. фон Кехлі была прапанавана міністру ўнутраных спраў Віленскім генерал-губернатарам. Аднак у гэтым жа лісце губернатар прасіў паскорыць адстаўку земскага начальніка 6-га ўчастка Вілейскага павета Б. фон Рыдыгера. Ён адзначаў, што адстаўка гэтая вымушаная, і прашэнне было пададзена Рыдыгерам па патрабаванню Дз. Любімава «в виду безобразий, которыя он (Рыдзігер – С. Т.) творил в пьяном виде, страдая запоем». Да зацвярджэння прашэння Б. фон Рыдыгер, «оставаясь земским начальником, ничем лично теперь уже не рискуя, продолжает компрометировать институт земских начальников своим нетрезвым поведением» [9, арк. 67–68]. Такім чынам, мясцовая адміністрацыя пазбягала прызначэння земскімі начальнікамі прэтэндэнтаў з мясцовых спадчынных дваран-католікаў. Пры гэтым нізкія службовыя і асабістыя якасці некаторых іншых асоб, прызначаных з улікам веравызнання, прыводзілі да неабходнасці змяшчэння іх з пасады. У выніку месцы заставаліся вакантнымі. У прыватнасці, да 1 студзеня 1912 г. у 35 беларускіх паветах у 210 участках пасады земскіх начальнікаў займалі 157 праваслаўных (74,7 %), 13 лютэран (6,2 %), 9 католікаў (4,3 %), 1 магаметанін (0,5 %), па 11 чал. (5,2 %) звесткі аб веравызнанні недакладныя, а 19 месцаў (9,0 %) былі вакантнымі. Найбольшая колькасць незанятых пасад прыходзілася на Мінскую (6) і Магілёўскую (5) губерні [10]. Аднак нават у такой сітуацыі ўрад не жадаў паўтарэння падзей 1863–1864 гг., таму пазбягала прызначэння іх на пасаду земскіх начальнікаў.

Такім чынам, шматлікія нараканні з боку мясцовых улад і скаргі насельніцтва на дзейнасць земскіх участковых начальнікаў, а таксама адмена ў 1906 г. абмежаванняў па саслоўнай прыкмеце на займанне названай пасады прывялі да неабходнасці ўзмацнення кантролю над асабовым складам гэтых чыноўнікаў. Першыя экзамены паказалі няведанне прэтэндэнтамі заканадаўства, якім яны павінны былі кіравацца пры выкананні службовых абавязкаў. У выніку Міністэрства ўнутраных спраў увяло ў губернскіх прысутнасцях абавязковыя іспыты па спецыяльна распрацаванай праграме для жадаючых займаць пасаду земскага начальніка. Аднак тыя асобы, якія ўжо мелі вопыт працы ва ўстановах па сялянскіх справах, не экзаменаваліся, але не ўсе з іх дакладна ведалі і выконвалі свае абавязкі. З гэтай прычыны МУС з 1908 г. увёў абавязковыя праверкі (рэвізіі) дзейнасці земскіх начальнікаў, якія давалі магчымасць не толькі кантраляваць, але і карэкціраваць і ў пэўнай ступені накіроўваць у патрэбнае рэчышча дзейнасць гэтых чыноўнікаў. Існаванне абмежаванняў пры замяшчэнні пасад у мясцовым кіраванні ў краі прадстаўнікамі рымска-каталіцкага веравызнання прыводзіла да недахопу прэтэндэнтаў пры фарміраванні кадравага складу земскіх начальнікаў і мела негатыўныя наступствы для рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Положение о земских участковых начальниках : Высочайше утвержденное 12 июля 1889 г. мнение Гос. Совета // Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – Собр. 3-е. – Т. 9 (1889). – № 6196. – СПб., 1891. – С. 508-524.
2. О некоторых изменениях и дополнениях в действующих постановлениях о земских участковых начальниках : Высочайше утвержденное 19 апр. 1904 г. мнение Гос. Совета // ПСЗРИ. – Собр. 3-е. – Т. 24 (1904). – Отд. 1. – № 24388. – СПб., 1907. – С. 368-371.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

3. Программа испытания на должность земского начальника и правила о временных курсах для подготовки лиц, желающих подвергнуться испытанию на должность земского начальника / сост. В. Максимов. – М. : Изд. кн-ва «Юрист», тип. И. Н. Холчева, 1909. – 104 с.
4. Об отмене некоторых ограничений в правах сельских обывателей и лиц других бывших податных состояний : Именной Высочайший указ, данный Сенату 4 окт. 1906 г. // ПСЗРИ. – Собр. 3-е. – Т. 26 (1906). – Отд. 1. – № 28392. – СПб., 1909. – С. 891–893.
5. Известия Земского отдела : Ежемес. журн. изд. при Земск. отд. М-ва внутр. дел. – 1908. – № 7–8.
6. Труды съезда непременных членов губернских присутствий 24 октября – 1 ноября 1907 г. / М-во внутр. дел. – СПб., 1908. – [4], 155 с.
7. Краткий обзор десятилетней деятельности крестьянских учреждений Виленской губернии, преобразованных по закону 12 июля 1889 г. (1903 – 1 декабря 1913 г.) /Сост. Виленским губернским присутствием. – Вильна: Губернская типография, 1913. – 37 с.
8. Съезд непременных членов губернских присутствий и землеустроительных комиссий. Труды Съезда непременных членов губернских присутствий и землеустроительных комиссий. 10–23 янв. 1909 г. / МВД. – СПб., 1909. – [6], XVIII, 363 с.
9. Дело по вопросу о назначении на должности земских начальников лиц польского происхождения и католического вероисповедания // Российский государственный исторический архив (РГИА). – Фонд 1291. – Оп. 30, 1903 г., гр. Г. – Д. 175. – 68 л.
10. Список лиц, служащих по ведомству Министерства внутренних дел, 1912 года (исправлен по 1 января): в 2 ч. – Ч. II: Губернии, области, градоначальства / По I отделению Департамента Общих дел. – СПб.: Тип-я Министерства внутренних дел, 1912. – С. 59–62, 71–76, 159–165, 336–344, 352–357.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ